Тыпалогія рэнамінацыі беларускіх перыядычных выданняў XIX−XXI стст.

НАЗВА ПЕРЫЯДЫЧНАГА ВЫДАННЯ, ОНІМ, АНАМАСТЫКА, РЭНАМІНАЦЫЯ, ПЕРАЙМЕНАВАННЕ

Тыпалогія рэнамінацыі беларускіх перыядычных выданняў XIX−XXI стст. [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Лухверчык В.М. - Мн., 2020. - 87 с., 3 дадаткі - Бібліягр.: С. 68 (16 назв.). - № ДР 20200588.

**Мэта:** распрацаваць канцэпцыю даследавання рознаўзроўневай рэнамінацыі ў галіновай онімнай сістэме (на матэрыяле назваў беларускіх перыядычных выданняў XIX−XXI стст.). У аснове даследавання ляжыць супастаўляльны аналіз больш за 2100 найменняў беларускіх газет, часопісаў, бюлетэняў, з якіх каля 40% з'яўляюцца рэнамінантамі, г. зн. ад аднаго да шасці разоў змянялі сваю назву.
**Метады:** апісальны метад сінхроннага аналізу з элементамі дыяхраніі, параўнальна-супастаўляльны, асобныя прыёмы кампанентнага аналізу, прыёмы машыннай апрацоўкі дадзеных і колькасныя падлікі.
**Вынікі:** створаны электронны рэестр назваў-рэнамінантаў беларускіх перыядычных выданняў; праведзена параметрызацыя электроннага рэестра назваў-рэнамінантаў беларускіх перыядычных выданняў; выяўлены кластар храналагічна аддаленых і храналагічна набліжаных найменняў беларускіх перыядычных выданняў; створана тыпалогія назваў-рэнамінантаў беларускіх перыядычных выданняў.
**Ступень укаранення.** Вучэбны працэс БДПУ.
**Вобласць выкарыстання**: вынікі НДР рэкамендуецца выкарыстоўваць для далейшага ўнармавання нацыянальнай онімнай лексікі ў плане кадыфікацыі і ў плане функцыянавання; пры складанні рознага тыпу слоўнікаў і даведнікаў сучаснай беларускай мовы; у працэсе выкладання беларускай мовы і журналістыкі ў вышэйшых навучальных установах; пры стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па анамастыцы, беларускай мове і гісторыі журналістыкі.